**УДК 351.853.3(476.5)+ 903.57:726.82(476.5)"13/17"** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-69-1-24-28**

# ПЛІНФА Ў ПАХАВАННЯХ XI–XIV СТСТ. У ПОЛАЦКУ[1]

***А.Л. КОЦ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***

*У артыкуле прадстаўлены матэрыялы даследавання пахавальных комплексаў старажытнарускага часу. У асобных пахаваннях зафіксаваны суправаджальны атрыбут – старажытная цэгла (плінфа). Яе клалі пад галаву нябожчыка. У літаратуры такія дэталі вызначаюцца як "каменныя падушкі". Даследчыкі іх звязваюць з аскетычнасцю памерлага. У Полацку выяўлена не менш 9 падобных прыкладаў. З іх 4 у грунтовых пахаваннях пры каменных цэрквах і 5 у саркафагах храмаў. Плінфу ў пахаваннях выкарыстоўвалі з таго мураванага помніка, пры якім (або ў межах якога) былі зладжаны могілкі. Ва ўсіх пахаваннях у Полацку выкарыстаны кавалак ці некалькі кавалкаў плінфы, у асобных выпадках цэлая, але пашкоджаная, цагліна. Папярэдне вызначана, што плінфу пад галаву маглі класці ў пахаванне сацыяльна значнай асобы.*

***Ключавыя словы:*** *Полацк, пахавальныя помнікі XI–XIV стст., пахаванне, могілкі, плінфа, "каменныя падушкі".*

**Уводзіны.** Пахавальныя комплексы Полацка XI–XIII стст. былі вельмі слаба даследаваны да апошняга часу. Аб даследаваннях "курганнага насельніцтва" Полацкай зямлі і ваколіц горада мы ведаем: сотні раскапаных курганаў, якім прысведчаны як вялікая колькасць артыкулаў [3; 10; 11; 12], так і асобныя манаграфіі [5; 22; 25]. За апошняе дзесяцігоддзе ў Полацку выяўлена не менш 4 пахавальных комплексаў, якія можна датаваць старажытнарускім часам. Да гэтага часу ў горадзе былі даследаваны шэраг могілак перыяду XVI–XVIII стст. [24], а ў выніку шурфовак зафіксаваны асобныя пахаванні, але, як правіла, без датавання і падрабязнай атрыбутацыі. Адзіным раскапаным пахавальным помнікам старажытнарускага часу да 2000-х гадоў з'яўляўся храм-пахавальня Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра, дзе зафіксаваны парэшткі людзей у саркафагах [16, с. 243], але калі архітэктурныя асаблівасці помніка дастаткова шырока прадстаўлены ў гістарыяграфіі, то характарыстыкі пахаванняў не стае.

Сучаснае антрапалагічнае вывучэнне[2] таксама дазволіла даследчыкам у значнай ступені больш асэнсавана паглядзець на мясцовае насельніцтва і зрабіць параўнаўчыя высновы аб жыхарах Полацка і Полацкага княства ў часавай і тапаграфічнай прасторы [13]. Такім чынам, зараз вядомыя 5 могільнікаў XI–XIII стст. у Полацку, якія дакладна зафіксаваны (малюнак):

1) пахаванні ў крыптах Спаса-Праабражэнскага храма Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра;
2) пахаванні ў крыптах храма-пахавальні Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра;
3) могілкі пры храме-пахавальні Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра;
4) могілкі пры храме на Стрэлцы Ніжняга замка;
5) могілкі пры мяркуемым храме на Верхнім замку, якія былі даследаваны ў апошнія гады.

Адзіночнае пахаванне XII ст. было знойдзена на тэрыторыі Полацкага гарадзішча [23, с. 22], але паўнавартасных могілак гэтага перыяду тут не выяўлена. Усе косныя парэшткі выяўлены падчас раскопак 2007 і 2009 гг. і адносяцца да цвінтара XVII–XVIII стст. [7; 18, с. 313–320]. Яшчэ адно пахаванне старажытнарускага часу было зафіксавана на пляцоўцы на ўсход ад Сафійскага сабора [1, с. 23]. Таксама пахавальныя комплексы існавалі ў межах Сафійскага сабора, храма на Стрэлцы Ніжняга замка, храма Ражаства Хрыстова на Рове, магчыма, у Пятніцкай царкве Барыса-Глебскага (Бельчыцкага) манастыра [4]. Але ўсе гэтыя храмы маюць выключна фрагменты каменных ці плінфяных саркафагаў, пахавальныя камеры, дэталі шыферных саркафагаў, аркасоліі і інш. без парэштак памерлых.

**Асноўная частка.** Падкладка пад галаву нябожчыка кавалкаў плінфы ці цэлых экземпляраў з'яўляецца дастаткова распаўсюджанай практыкай. Падчас даследаванняў полацкіх могілак XII–XIII стст. зафіксаваны шэраг прыкладаў выкарыстання плінфы ў пахаваннях. Яны атаясамліваюцца з падушкамі, якія ўкладалі ў магілы памерлых, гарантуючы ім камфорт. У іншым варыянце даследчыкі звязваюць "каменныя падушкі" з сімвалам хрысціянскага аскетызму [24, с. 130]. Разам з тым можна адзначыць, што ў магілы епіскапаў, прадстаўнікоў княжаскага рода і баяр маглі класці мяккія тэкстыльныя падушкі [5, с. 93]. Размяшчэнне галавы нябожчыка на цвёрдай падушцы мае глыбокія хрысціянскія карані і звязана з біблейскімі матывамі. Асобныя даследчыкі прасочваюць сэнсавыя паралелі з дзейнасцю прабацькі Ізраіля Якава. Камень (ці плінфа) з'яўляўся сімвалам выканання заветаў "Лесвіцы", якая стварала ўстойлівую асацыяцыю дарогі памерлага ў іншасвет. Паралелі з біблейскімі сюжэтамі атаясамліваюцца з пахаваннямі манахаў, якія імкнуліся сваёй праведнай працай дасягнуць вечнага жыцця [2, с. 174].

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў «Пахавальныя помнікі Полацка XI–XVIII стст. у кантэксце развіцця сінхронных некропалей Беларускага Падзвіння: пахавальны абрад, інвентар, палеаантрапалагічная характарыстыка» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221071 ад 06.07.2022)."

[2] Антрапалагічную экспертызу для знаходак косных парэштак праводзіць дацэнт кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, кандыдат біялагічных навук В.А. Емяльянчык.




1 – першапачатковае гарадзішча; 2 – Верхні замак; 3 – Вялікі пасад; 4 – Запалоцкі пасад; 5 – мяркуемыя месцы размяшчэння курганных могільнікаў; 6 – Барыса-Глебскі (Бельчыцкі) манастыр; 7 – Спаса-Еўфрасіньеўскі манастыр; 8 – храм-пахавальня з грунтовым могільнікам пры ім; 9 – Спаса-Праабражэнскі храм; 10 – храм на Стрэлцы Ніжняга замка і грунтовы могільнік пры ім; 11 – грунтовы могільнік XI–XIII стст. пры мяркуемым храме на Верхнім замку

**Малюнак. – План распаўсюджання культурнага пласта і гістарычных помнікаў Полацка XI–XII ст. з пазначэннем грунтовых могільнікаў**

У Полацку зафіксавана не менш 9 пахаванняў, дзе выяўлена плінфа ў якасці падкладак пад галаву нябожчыкаў. З іх 4 прыклады фіксуюцца ў грунтовых пахаваннях і 5 варыянтаў – у плінфяных саркафагах храма-пахавальні і Спаса-Праабражэнскай царквы Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра. Тым не меньш, дакладную колькасць вызначыць немагчыма, бо не стае інфармацыі аб пахаваннях у саркафагах храма-пахавальні [16].

Храм-пахавальня Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра з'яўляецца адным з самых шырока даследаваных археалагічнымі раскопкамі помнікаў мураванага дойлідства Полацка XI–XIII стст. Наяўнасць вялікай колькасці пахавальных плінфяных камер далі яму прыгаданую назву. Усе вядомыя склепы і саркафагі былі ўскрыты ў 1960-я гг. Недасканаласць методыкі вывучэння і абмежаваная фіксацыя архітэктурных элементаў і археалагічных дэталяў не дазваляе на сённяшні дзень у поўнай меры вызначыць пахавальныя традыцыі, характар антрапалагічнага матэрыялу і іншыя элементы пахавальнай практыкі. Агулам было зафіксавана не менш 30 падземных камер, адной з якіх з'яўляецца вялікая крыпта ў паўночнай галерэі [16, с. 243], па іншых звестках – 37 [4, с. 21]. Відавочна, што ў храме існавалі і наземныя пахавальныя саркафагі, адзін з якіх лакалізуецца ў паўночнай галерэі, астатнія – у інтэр'еры царквы. Па вызначэнні М.К. Каргера, пахаванні захаваліся далёка не ва ўсіх саркафагах. Парэшткі належалі, у асноўным, старым мужчынам, некаторыя – жанчынам, пахаваным у позні перыяд гісторыі манастыра [16, с. 243–244]. Дадзенае антрапалагічнае вызначэне няпэўнае і аўтар раскопак не падае спасылкі на антрапалагічную экспертызу [15]. Нажаль, на сённяшні дзень інфармацыя аб месцы захавання костак адсутнічае. Грунтоўнае вывучэнне фотаздымкаў раскопак[3] дазваляе засведчыць, што ў склепах захавалася не менш васьмі некранутых касцякоў, але ў некаторых былі зроблены падпахаванні, або пераадкладзены косткі з іншых камер. Інфармацыя аб парэштках людзей у іншых саркафагах адсутнічае. Усе нябожчыкі паводле хрысціянскай традыцыі былі пакладзены галавою на захад. Дзякуючы наяўным фотаздымкам атрымалася вызначыць, што, як мінімум, у трох некранутых пахаваннях былі пакладзены плінфы пад галаву. Яшчэ ў адным пустым саркафагу плінфа знаходзілася ў заходняй частцы і таксама магла выступаць "каменнай падушкай". Мяркуючы па фотаздымках, з доляй верагоднасці можна вызначыць прысутнасць выключна кавалкаў старажытнай цэглы ў пахаваннях. Больш дакладныя звесткі аб колькасці і асаблівасцях, магчыма, утрымліваюць палявыя матэрыялы М.К. Каргера, вартыя дасканалай апрацоўкі.

[3] Аналіз фотаздымкаў саркафагаў храма-пахавальні быў зроблены пад час апрацоўкі матэрыялаў раскопак М.К Каргера, якія захоўваюцца ў фотааддзеле навуковага архіва Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук.

Падчас раскопак храма-пахавальні ў 2017 г. былі выяўлены могілкі на захад ад царквы. Папярэднія даследаванні 1960-х, і 2016 г. мелі на мэце толькі вывучэнне архітэктурных асаблівасцей помніка [19, с. 277], таму пляцоўка вакол храма не абследавалася. У 2017 г. былі закладзены шурфы на захад ад падмуркаў царквы з мэтай удакладнення лакалізацыі прытвора з брусковай цэглы, зафіксаванага М.К. Каргерам, і вызначэння характару культурных напластаванняў. У шурфах было зафіксавана 7 пахаванняў (шурф 7 – 1 пахаванне; шурф 8 – 4, траншэя 1 – сляды 2 пахаванняў). Усе пахаванні безінвентарныя, зроблены без трунаў. Могілкі вызначаюцца як шматслойныя, таму можна меркаваць аб працяглым тэрміне іх функцыянавання. У пахаванні 4 з шурфа 8 была выяўлена плінфа пад галавой памерлага. Шкілет быў ускрыты часткова: ніжняя частка засталася ва ўсходняй сценцы. Памерлы быў пакладзены на спіну і косткі захаваліся ў анатамічным парадку. Полавая прыналежнасць да жанчыны вызначана недакладна. Чэрап ляжаў на плінфе і быў закулены на грудзі. Плінфа была часткова пашкоджана і не мела слядоў рошчыны, відавочна, яна не была выкарыстана ў кладцы сцяны. Яе памер і колеравая гама адпавядаюць цэгле, характэрнай для кладкі храма-пахавальні. У магільнай яме, уздоўж сценак, з правага і левага бакоў ад памерлага вызначаны таксама дзве плямы вапнавай рошчыны невядомага паходжання. Лакалізацыя могілак пры храме XII ст. і наяўнасць плінфы ў пахаванні дазваляюць прадатаваць комплекс перыядам Сярэднявечча.

У часе раскопак 2014 г. на Стрэлцы Ніжняга замка было выяўлены два розначасовыя пахавальныя комплексы. Першы датуецца перыядам позняга Сярэднявечча, а другі – XVII ст. [8, с. 181]. Сярэдневяковыя пахаванні, якія адназначна можна атаясамліваць з прыхрамавымі могілкамі, з'яўляюцца, амаль што ўсе, безінвентарнымі. У адным выпадку ў пераадкладзеным пахаванні быў зафіксаваны пярсцёнак XIII–XIV стст. на фаланзе пальца, таксама на грудзях жанчыны была выяўлена бразготка XIII–XIV стст. Ускосную дату даюць і знаходкі плінфы, пакладзеныя ў магілы да нябожчыкаў. З 35 зафіксаваных пахаванняў, у трох былі выяўлены плінфы. Пахаванне 13 арыентавана галавой на захад і захавалася ў анатамічным парадку. Яно пашкоджана і перакрывае пахаванне 14. Косткі дрэнна захаваліся. У магілу пакладзены парэшткі жанчыны ўзростам 30–50 гадоў. Памерлы пакладзены на спіне. Часткова раструшчаны чэрап ляжаў тварам на правы бок. Пад чэрапам быў падкладзены палавінчаты фрагмент плінфы. Пад фрагментам плінфы змешчана сцягнавая костка іншага пахавання, якое было закранута падчас выкапвання магілы. Рукі пакладзены на жывот: правая перакрывае левую. Пад правай сцёгнавай косткай размяшчаўся яшчэ адзін фрагмент плінфы [9, с. 25]. Пахаванне 24 арыентавана галавой на захад, касцяк захаваны ў анатамічным парадку. Нябожчык пакладзены на спіну. Чэрап ляжыць на правым баку, а каля яго, з левага боку, выяўлены кавалак плінфы, відавочна, пакладзены ў магілу. Пахаванне моцна пашкоджана: адсутнічаюць рэбры, часткова пазванкі, косткі рук [9, с. 26]. Антраполагам косткі вызначаны як дзіцячыя ва ўзросце 13–15 гадоў. Пахаванне 52 захавалася ў анатамічным парадку і арыентаваны галавой на захад. Нябожчык пакладзены на спіну. Чэрап ляжыць на левым баку, і пад ім зафіксаваны фрагмент плінфы. Рукі пакладзены на жываце: правая вышэй, левая ніжэй [9, с. 28]. Усе знаходкі фрагментаў плінфы ў пахаваннях маюць марфалагічнае і параметрычнае падабенства з будаўнічымі матэрыяламі храма, лакалізаванага пры пазначаных могілках на Стрэлцы Ніжняга замка. Антрапалагічныя асаблівасці мужчынскіх чарапоў вызначаюць падабенства з матэрыяламі курганных пахаванняў з тэрыторыі Полацкай зямлі, але, разам з тым, па комплексу прыкмет фіксуецца прышлы кампанент, які ўдзельнічаў у фарміраванні насельніцтва Полацка, пахаванага пры храме на Стрэлцы Ніжняга замка [14, с. 22].

Тры кавалкі плінфы былі вяўлены ў некранутым пахаванні ў саркафагу Спаса-Праабражэнскага храма. У ходзе археалагічных даследаванняў царквы былі выяўлены прыбудаваныя галерэі, у якіх размяшчаліся плінфяныя саркафагі. У раскопах зафіксавана 12 камер, але пры агульнай пашкоджанасці мураваных канструкцый галерэй познімі магільнымі ямамі, верагодней за ўсё, іх было больш 20-ці. Частка саркафагаў была разбурана, а частка засталася недаследаванай. Толькі ў адным саркафагу ў паўночнай галерэі было выяўлена некранутае пахаванне XII–XIII стст. У нагах памерлага было выяўлена раструшчанае шкляное начынне конусападобнай формы азначанага перыяду. Памерлы быў пакладзены на вапнавую падлогу саркафага. Пад галавой размяшчаліся тры кавалкі плінф ад розных экзэмпляраў. Яны маюць падабенства з плінфай названага храма. Іншага інвентара ў пахаванні зафіксавана не было. Антрапалагічная экспертыза вызначыла прыналежнасць костак індывіду жаночага полу ва ўзросце 20–30 год. У разбураных саркафагах касцякоў не зафіксавана, або ў іх былі пераадкладзеныя косткі нябожчыкаў, у тым ліку перыяду XI–XIII стст.

У 2020–2022 гг. на Верхнім замку ў Полацку быў выяўлены і даследаваны могільнікавы комплекс XI–XIII стст. Агулам тут зафіксавана больш 120 пахаванняў на плошчы каля 1600 м$^2$. Па антрапалагічных асаблівасцях памерлыя з азначаных могілак маюць блізкае падабенства да сярэднявечнага сельскага насельніцтва Полацкай зямлі, прадстаўленага матэрыяламі курганных могільнікаў. Падчас даследаванняў было вызначана, што на пляцоўцы могілак фіксуецца слой разбурэння мураванага помніка. Археалагічнымі даследаваннямі не атрымалася лакалізаваць мураваны храм, але кантэкст культурнага пласта і характар размяшчэння пахаванняў дазваляюць ускосна вызначыць, што могілкі размяшчаліся пры старажытнай каменнай царкве [20, с. 11]. У параўнанні з іншымі помнікамі, нягледзячы на такое суседства мяркуемага мураванага храма і могілак, плінфа ў магілах не выяўлена. Большасць пахаванняў была зафіксавана ў драўляных трунах, якія дзякуючы "мокраму" культурнаму слою захаваліся тут выдатна.

**Заключэнне.** Такім чынам, на сённяшні дзень у Полацку на пахавальных комплесах XI–XIV стст. фіксуецца не менш 9 памерлых, пакладзеных на плінфу. З іх 4 у грунтовых пахаваннях з больш чым 160 раскапаных магіл з трох гарадскіх некропаляў (2,5%) і 5 у саркафагах з не менш як 67-мі археалагічна зафіксаваных у 4-х храмах (7,5%).

Падкладанне пад галаву “каменных падушак” з плінфы сустракаецца на многіх пахавальных комплексах іншых гарадоў Усходняй Еўропы: на могілках вакольнага горада ў Навагрудку (другая палова XI–XIII ст.) [21, с. 116], у храмах або на могілках пры цэрквах у Пскове, Ноўгарадзе, Чарнігаве, Кіеве і інш. [21, с. 114–116]. У храмах Смаленска “каменныя падушкі” выяўлены ў некалькіх дзясятках пахаванняў XII–XIV стст. [21, с. 114–115]. У руінах Ніжняй царквы ў Гродна (канец XII – першая палова XIII ст.) у пахаванні дзяўчынкі каля галавы ляжаў невялікі кавалак арачнай цаглянай (плінфяной) кладкі [6, с. 179]. Традыцыя выкарыстання плінфы ў пахаваннях дажывае да XIV ст. Для больш позніх помнікаў можна назіраць эпізадычныя выпадкі выкарыстання ў якасці падушак брусковай цэглы. Яскравымі прыкладамі з’яўляюцца пахаванні XVI ст. з могільніка 1 на помніку Лучна ў Полацкім раёне [17, с. 22–23] і пры Спаса-Праабражэнскім храме ў Полацку перыяду XVIII – пач. XIX ст.

Выкарыстанне “каменных падушак” вызначаецца як прыкмета хрысціянскага аскетызму [2, с. 174]. На аснове полацкіх матэрыялаў папярэдне бачым, што падкладанне плінфы або кавалка (ці кавалкаў) пад галаву здзяйснялася, у асноўным, для статуснага насельніцтва. У Полацку большасць пахаванняў з плінфай пад галавой была зроблена ў саркафагах, што вызначае прадстаўнічасць памерлага і падкрэслівае яго аскетычнасць. Відавочным з’яўляецца той факт, што плінфу ў пахаваннях выкарыстоўвалі з таго мураванага помніка, пры якім (або ў межах якога) былі зладжаны могілкі. Большасць пахаванняў з плінфай вызначаны антраполагам як жаночыя, асобныя адносяцца да дзіцячых[4], але гэта не дае канчатковай упэўненасці ў выснове пра гендэрны падзел пры выкарыстанні “каменных падушак” у пахавальнай абраднасці. Цікавай акалічнасцю з’яўляецца выкарыстанне выключна кавалка ці некалькіх кавалкаў плінфы, у асобных выпадках – цэлай, але пашкоджанай цагліны. Гэта дазваляе вызначыць, што ў пахаваннях выкарыстоўваліся астатачныя плінфы, якія ўжо не былі прыдатныя для будаўніцтва ці не выкарыстоўваліся пры кладцы сцяны.

## ЛІТАРАТУРА


1. Архитектурно-археологические исследования Софийского собора в Полоцке в 1975 – 1980, 1984 гг. / И.В. Антипов, Д.Д. Ёлшин, А.В. Жервэ, Е.А. Немыкина, А.В. Трушникова, А.А. Фрезе // Архитектурное наследство. – СПб.: Коло 2021, – Вып. 74. – С. 16–27.
2. Беляев Л.А. Каменные «подушки» монашеских погребений и их ветхозаветный прототип // Российская археология. – 2005. – № 4. – С. 171–175.
3. Войтехович А.В. Курганные захоронения Полоцкой округи IX–XI вв. // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О.Н. Левко и др.; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко. — Минск: Белар. навука, 2012. — С. 54–58.
4. Вайцяховіч А.В. Пахавальны абрад некропалей полацкіх культавых будынкаў XII–XIII стагоддзяў // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2008. – № 7. – С. 20–27.
5. Войтехович А.В. Погребальный обряд населения Полоцкой земли в X–XII вв. – Минск: Белар. навука, 2019. – 269 с.
6. Воронин Н.Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.). – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – 239 с.
7. Дук Д.У., Емяльянчык В.А. Могілкі полацкага гарадзішча (па выніках археалагічных раскопак у 2007 г.) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 21. – С. 61–73.
8. Дук Д.У., Емяльянчык В.А., Коц А.Л. Могілкі на стрэлцы Ніжняга замка ў Полацку // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2018. – Вып. 29. – С. 171–182.
9. Дук Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Ніжняга замка г. Полацка ў 2014 г. // Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Спр. № 3308.
10. Дучиц Л.В. Каменные курганы Полоцкой земли // Археология и история Пскова и Псковской земли. Материалы 50 научного семинара: сб. ст. / под ред. В.В. Седова. – Псков, 2004. – С. 386–395.
11. Дучыц Л.У. Да пытання аб познесярэдневяковых курганах Паўночнай Беларусі // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамадскіх навук. – 1989. – № 4. – С. 77–83.
12. Дучыц Л. Познесярэдневяковыя курганы Беларусі // Гіст.-археал. зб. – Мінск, 1997. – № 12. – С. 77–79.
13. Емяльянчык В.А. Вынікі антрапалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў 1998–2008 гады // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 лістап. 2008 г. / Пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 30–37.
14. Емельянчик О.А., Шипило В.А. Краниологическая характеристика материалов погребений с территории Нижнего Замка в Полоцке // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2018. – № 1 (23). – С. 18-23.
15. Каргер М.К. Альбом к отчёту об археологических раскопках 1962 г. в Полоцке и Новогрудке // Фонд археологической научной документации Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси. – Д. № 166а.
16. Каргер М.К. Храм-усыпальница в Евфросиниевском монастыре в Полоцке // Советская археология. – 1977. – № 1. – С. 240–246.
17. Клімаў М.В. Лучанскі грунтовы могільнік I // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навуковых канферэнцый / рэдкал.: Г.У. Савіцкі. – Мінск: Нацыянальная бібліятэка, 2013. – С. 20–23.
18. Клімаў М.В. Новыя археалагічныя даследаванні ў гарадах Падзвіння ў 2009 годзе // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 23. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009– 2010 гадах. – С. 313–323.


[4] Антрапалагічная экспертыза была зроблена толькі для могілак на Стрэлцы Ніжняга замка, могілак пры храме –пахавальні і пахаванняў пры Спаса-Праабражэнскім храме.

19. Магалінскі І.У., Торшын Я.М., Зыкаў П.Л. Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра ў 2016 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2018. – Вып. 29. – С. 277–280.
20. Папярэднія вынікі даследавання могільніка XI–XIII стст. на тэрыторыі Верхняга замка Полацка / І.У. Магалінскі, В.А.Емельянчык, А.Л. Коц, П.М. Кенько // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2023. – № 2(67). – С. 6–12.
21. Макаров Н.А. Каменные подушки в погребениях древнерусских городских некрополей // Советская археология. – 1981. – № 2. – С. 111–116.
22. Курганныя могільнікі захаду Браслаўскага Паазер'я (матэрыялы раскопак 1978–2010 гадоў) / М.А. Плавінскі, Л.У. Дучыц, А.М. Плавінскі, В.І. Шадыра. – Мінск: Галіяфы, 2014. – 220 с.
23. Тарасов С.В. Отчёт о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 г. // Фонд археологической научной документации Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси. – Дело № 1014.
24. Чараўко В.У. Пахавальныя помнікі Полацка XIV–XVIII стст. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2019. – № 1. – С. 129–135.
25. Штыхаў Г.В. Крывічы: па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.

*Паступіў 08.12.2023*

## ПЛИНФА В ПОГРЕБЕНИЯХ XI–XIV ВВ. В ПОЛОЦКЕ

***А.Л. КОЦ***
***(Полоцкий государтсвенный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье представлены материалы исследований погребальных комплексов древнерусского периода. В отдельных погребениях зафиксирован сопроводительный инвентарь – древний кирпич-плинфа. Её клали под голову умершего. В литературе такие детали определяются как «каменные подушки». Исследователи связывают их с аскетичностью умершего. В Полоцке зафиксировано 9 могил с плинфой, из них 4 в грунтовых погребениях на кладбищах при церквях и 5 в саркофагах каменых храмов. Плинфу использовали с того же памятника, при котором (или в котором) были устроены погребения. Во всех зафиксированных примерах в Полоцке использовались один или несколько кусков плинфы. В отдельных случаях целый кирпич, но с повреждениями. Предварительно определено, что плинфу под голову могли укладывать в могилу социально значимого лица.*

***Ключевые слова:*** *Полоцк, погребальные памятники XI–XIV вв., погребение, кладбище, плинфа, «каменные подушки».*

## PLYNTH IN THE BURIALS OF THE XI$^{th}$ – XIV$^{th}$ CENTURIES IN POLOTSK

***A. KOTS***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article presents materials from studies of burial complexes of the Ancient Rus' period. In some burials, accompanying grave goods were recorded - an ancient brick plinth. It was placed under the head of the deceased. In the literature, such details are defined as "stone pillows". Researchers associate them with the asceticism of the deceased. 9 graves with plinths were recorded in Polotsk. 4 were in ground burials in church cemeteries and 5 were in sarcophagi of stone churches. The plinth was used from the same monument at which (or in which) the burials were located. In all examples in Polotsk were used one or more pieces of plinth. In some cases, there is a whole brick, but with damage. It has been previously determined that the plinth under the head could have been placed in the grave of a socially significant person.*

***Keywords:*** *Polotsk, funerary monuments of the XI$^{th}$ – XIV$^{th}$ centuries, burial, cemetery, plinth, "stone pillows".*